5. Специальный инструмент (баян, аккордеон) : учеб. пособие. в 2 ч. / сост.: В. П. Бубен, А. И. Ковалев. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2010. – Ч. 2. – 130 с. : ил.

6. *Чабан, В. А.* Баяннае мастацтва Беларусі / В. А. Чабан. – Мінск : Беларус. дзярж. акадэмія музыкі, 1997. – 185 с.

# АБ РАЗВІЦЦІ АМАТАРСКАГА ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА БРЭСТЧЫНЫ (да 1940-х гг. XX ст.)

***Т. Ю. Трафімчук,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, выкладчык*
*Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р. Шырмы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактаграфічна летапіс тэатральнага мастацтва Брэста[1] можна пачаць з 1566 г., калі сярод прафесій гараджан, прадстаўленых у захаваўшымся інвентары, узгадваюцца скамарохі Тыт, Герасім і Герман.

З XVI ст. важным асяроддзем развіцця тэатральнай дзейнасці становяцца хрысціянскія асветніцка-адукацыйныя аб'яднанні і ўстановы, дзе ствараюцца свае школьныя тэатры. Як падкрэслівае В. Дадзіёмава, гэты від тэатра з'яўляўся не толькі і не столькі з'явай уласна мастацкай, колькі дыдактычна-выхаваўчай. «Яго пастаноўкі, – піша даследчыца, – далучалі моладзь да сусветнай гісторыі, прывівалі цікавасць да навукі і мастацтва, развівалі добры густ і выхоўвалі пэўныя маральныя якасці. Акрамя таго, на рэпетыцыях і спектаклях адкрываліся магчымасці практычна замацаваць навыкі, атрыманыя навучэнцамі падчас заняткаў рыторыкай, красамоўствам, паэтыкай і іншымі вучэбнымі прадметамі. Гэтаксама і выкананне імі музычных твораў на працягу спек-

[1] Для дадзенай працы метадалагічна важным з'яўляецца прыняты ў мастацтвазнаўстве рэгіянальны падыход, што прадугледжвае ўключэнне ў даследчыцкае поле і разгляд мастацкіх артэфактаў, якія фарміраваліся і функцыянавалі на тэрыторыі Брэста ў яго сучасных тапанімічных і геапалітычных межах з уключэннем некаторых блізкіх тэрыторый Брэсцкай вобласці (Брэстчыны).

такля было пэўным «гульнявым» увасабленнем навыкаў, атрыманых на музычных занятках» [5, с. 70].

У Брэсце вучнёўскія спектаклі ладзіліся намаганнямі каталіцкага ордэна езуітаў. У 1615 г. пад іх патранатам была арганізавана першая школьная пастаноўка [5, с. 69], а з 1696 па 1769 г. пры мясцовым Езуіцкім калегіуме (быў пабудаваны ў 1623 г.) існаваў свой уласны школьны тэатр. Вядома, што ў 1729 г. у ім адбыліся пастаноўкі твора «Святы Ксаверы», а пасля 1750 г. – «Святы Антоній Падуанскі». Паказы праходзілі на добра абсталяванай сцэне з выкарыстаннем асаблівых аб'ёмных дэкарацый (башні, фігур, якія маглі рухацца і ўздымацца на шнурах) [6][2].

Аматарскі тэатр таксама развіваўся ў свецкім культурным асяроддзі Брэстчыны XVII–XVIII стст.

У гарадах і мястэчках плённа выступалі тэатральныя трупы, у склад якіх маглі ўваходзіць прафесійныя акцёры. Рэпертуар характарызаваўся жанравай і змястоўнай разнастайнасцю: папулярнымі былі камедыі, трагедыі, рамантычная драма, меладрама, вадэвіль, камічная опера, а «пастаноўкі пацяшальнага характару сумяшчаліся са спектаклямі асветніцкага, маральна-выхаваўчага кірунку» [3, с. 83].

Іншая плынь тэатральнага мастацтва, якая адрознівалася духам вытанчаных імпрэз і таварыскіх спатканняў, існавала ў маёнтках і сядзібах. Тут выступалі як прафесійныя майстры, так і таленавітыя аматары, якія выконвалі творы замежных і мясцовых аўтараў.

У навучальных установах працягваліся традыцыі школьнага тэатра з яго выхаваўча-дыдактычнымі магчымасцямі. А. К. Чартарыйскі, вядомы палітычны, культурны дзеяч і камендант Варшаўскага кадэцкага корпуса Рыцарскай школы,

[2] Школьныя тэатры існавалі і пры іншых каталіцкіх ордэнах, аднак пра практыку вучнёўскіх пастановак у бернардзінцаў, бернардзінак, трынітарыеў, дамініканцаў, брыгітак, якія ў першых дзесяцігоддзях 1600-х гг. пачалі рассяляцца ў Брэсце, інфармацыі не захавалася. Дакладных звестак няма і пра тэатральныя пастаноўкі пры тагачасных праваслаўных брацтвах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцвярджаў, што «тэатр можа норавы нашы палепшыць, прыцягнуць да дабрадзейнасці і ад круцельства ахаваць, паправіць недахопы, зрабіць лепшым грамадзянінам і лепшым чалавекам у грамадскіх і асабістых справах» [2].

Прадстаўленыя ў разнастайных перапляценнях плыні свецкага тэатральнага мастацтва аказалі своеасаблівы ўплыў на творчую дзейнасць выхадца з Брэстчыны Ю. У. Нямцэвіча (1757–1841). Магчыма, з традыцыямі школьнага тэатра малады чалавек мог пазнаёміцца падчас навучання ў Брэсцкім езуіцкім калегіуме, але дакладна гэта адбылося, калі ён стаў кадэтам Рыцарскай школы ў Варшаве (1770–1777). Там малады чалавек удзельнічаў у тэатральных пастаноўках твораў А. К. Чартарыйскага «Панна на выданне», «Ганарлівец», «Гулец», п’ес французкіх і іншых аўтараў. З канца 1780-х гг. Ю. У. Нямцэвіч пачаў пісаць уласныя драматычныя творы, многія з іх увайшлі ў рэпертуар тэатраў XVIII–XX стст., у тым ліку і аматарскіх. Акрамя таго, у гонар славутага земляка ў міжваенны перыяд XX ст. быў створаны аматарскі калектыў – Грамадскі тэатр імя Ю. У. Нямцэвіча. З даследчых прац Т. Кабот вядома, што у яго ўваходзілі працоўныя людзі горада, вёскі, службоўцы арміі і моладзь. Тэрыторыя выступленняў калектыву ахоплівала Брэст і яшчэ 24 гарады Палескага ваяводства, 3 гарады ў Беластоцкай вобласці і 2 гарады ў Люблінскай вобласці. У сезоне 1938–1939 гг. у тэатры працавалі тры калектыва пад кіраўніцтвам прафесійнага рэжысёра У. Выганоўскага. Рэпертуар налічваў 14 п’ес, адаптаваных пад густ гледачоў [1].

Тэатральнае мастацтва Брэста канца XVIII–XIX стст. было прадстаўлена выступленнямі прыватных гастралюючых польскіх, рускіх, украінскіх, габрэйскіх, а таксама мясцовых труп і антрэпрыз (К. Камінскага, П. Ратаевіча, К. Шмітгофа, Я. Хелмікоўскага, М. Дальскага, М. Барысава і інш.). Сталага тэатра ў горадзе не было, таму драматычныя, музычна-драматычныя і оперныя пастаноўкі («Гамлет», «Севільскі цы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рульнік», «Русалка», «Фра-Дзьявало», «Дачка стагоддзя», «Кошт жыцця») ладзіліся на спецыяльна адведзеных для гэтага сцэнах, на падмостках навучальных устаноў, у гарадскім садзе.

У 1885 г. непрафесійныя тэатральныя суполкі Брэстчыны аб’ядналіся з харавымі і аркестравымі калектывамі ў (Брэст-Літоўскае) Музычна-драматычнае грамадства аматараў (існавала да пачатку 1910-х гг.). Задачамі яго было распаўсюджванне эстэтычных ведаў, музычнае выхаванне (выкладаліся музычна-тэарэтычныя веды і ігра на музычных інструментах), арганізацыя канцэртных, літаратурных і тэатральных сустрэч.

Выступленні прыватных (аматарскіх, прафесійных, мясцовых і тых, якія прыязджалі) і школьных тэатраў складалі аснову культурнага жыцця Брэста амаль да сярэдзіны XX ст.

Важны ўнёсак у тэатральнае жыццё горада (і ўсяго Палескага ваяводства) быў здзейснены шэрагам мастацкіх аб’яднанняў, сярод якіх і Брэсцкае музычнае грамадства (1924). Па яго ініцыятыве была адчынена музычная школа імя К. Шыманоўскага, дзе функцыянавала канцэртна-оперная студыя са сваімі салістамі, хорам, балетам і аркестрам. Навучэнцамі студыі, а таксама ўдзельнікамі царкоўнага хора пад кіраўніцтвам Панцілевіча і мясцовымі аматарамі ў 1920–1930-х гг. на брэсцкіх сцэнах былі пастаўлены творы «Страшны двор» і «Галька» С. Манюшкі, «Травіата» Дж. Вэрдзі, «Яўген Анегін» і ўрыўкі з «Пікавай дамы» П. Чайкоўскага, «Запарожац за Дунаем» С. Гулак-Арцемоўскага і інш.

З мэтай павышэння культуры вёсак і гарадоў было створана Таварыства пасоўвання аматарскіх калектываў на Палессі. У яго статуце ад 1929 г. прапісаны такія задачы, як: «стварэнне асабістай тэатральнай бібліятэкі з магчымасцю браць/даваць у пазыку кнігі і рэжысёрскія зборы; заснаванне ўласнага пракату тэатральных касцюмаў і рэквізіту; падрыхтоўка рэпертуару, які адпаведны для вясковых сцэн, і пад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыхтоўка праграм народных свят, адпаведных лекцый; уладкаванне ўзорных прадстаўленняў і лекцый з улікам рэгіянальных палескіх матываў; утрыманне сувязі з іншымі культурнымі арганізацыямі і інстытуцыямі; арганізацыя новых і пасоўванне тых, якія існуюць, годных аматарскіх тэатральных калектываў» [4].

Вядома, што ў 1920–1930-х гг. у Брэсцкім павеце Палескага ваяводства актыўна выступалі мясцовыя аматарскія тэатры Пажарнай аховы, Звязу стралковага, Таварыства беларускай школы, Гуртка вясковай моладзі, Таварыства сяброў дзяцей, Звязу настаўнікаў агульных школ, салдацкі тэатр пад кіраўніцтвам Я. Вішнеўскага, працаваў драматычны кружок «Зніч», калектыў працоўных брэсцкай чыгункі «Эха», Грамадскі тэатра імя Ю. У. Нямцэвіча. Пастаянна ладзіліся пастаноўкі гастралюючых труп Рэдуты Віленскай, Рэвіі Варшаўскай, Шопкі Варшаўскай, калектываў Намыслоўскага і Э. Гагарына, тэатра Tarbut і іншых прафесійных, паўпрафесійных і аматарскіх польскіх, рускіх, украінскіх і габрэйскіх тэатраў.

З 1940-х гг. пачынаецца перыяд усталявання прафесійнага тэатральнага мастацтва ў Брэсце. Так, са жніўня 1940 г. па май 1941 г. у горадзе працаваў Рускі драматычны тэатр (Брэсцкі абласны рускі драматычны тэатр), трупу якога складалі выпускнікі Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва (маст. кір. М. Тарханаў). У 1944 г. быў створаны Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі (зараз Брэсцкі абласны тэатр драмы). Трупа была сфарміравана з выпускнікоў Маскоўскага гарадскога тэатральнага вучылішча. Тэатр узначальваў беларускі рэжысёр М. Міцкевіч.

Такім чынам, доўгі час менавіта аматарскі тэатр заставаўся найбольш рэпрэзентатыўнай з’явай мастацка-тэатральнай культуры Брэстчыны. Прадстаўлены разнастайнымі формамі, ён ахопліваў і адлюстроўваў шырокі спектр запытаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасцяў грамадства, згуртоўваў вакол сябе таленавітых творцаў і выканаўцаў, аб'ядноўваў прафесіяналаў і аматараў мастацтва. У гэтым сэнсе аматарскі тэатр паўстае як шматскладовы феномен, які, з аднага боку, развіваўся ў цесным судотыку з культурным (сацыяльным, гістарычным, палітычным) кантэкстам розных эпох і перыядаў, а з другога – актыўна ўплываў на гэты кантэкст, напаўняючы і зменьваючы яго.

1. *Kabot, T.* Życie teatralne na Polesiu w latach międzywojennych [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: http://polesie.org/5095/zycie-teatralne-na-polesiu-w-latach-miedzywojennych/. – Data dostępu: 25.07.2019.

2. *Morawski, P.* Adam Kazimierz Czartoryski [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: http://encyklopediateatru.pl/autorzy/2996/adam-kazimierz-czartoryski. – Data dostępu: 25.07.2019.

3. Беларусы. Тэатральнае мастацтва / Р. Б. Смольскі [і інш.]. – Т. 13. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 758 с.

4. Государственный архив Брестской области. – Ф. 1. Оп. 2. Д.2421.

5. *Дадзіёмава, В. У.* Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя / В. У. Дадзіёмава. – Мінск : Беларус. дзярж. акад. музыкі, 2012. – 230 с.

6. Театр в Великом княжестве Литовском [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 24.06.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАБЛЕМА «ДРУГОГА» Ў ПАЭМЕ «КАНУН СВЯТОЙ АГНЭСЫ» Д. КІТСА І Ў АПАВЯДАННІ «ВАЛАСЫ, ЯКІЯ КРЫЧАЦЬ НА ГАЛАВЕ» (З «ШЛЯХЦІЦА ЗАВАЛЬНІ») Я. БАРШЧЭЎСКАГА

***С. М. Тычына,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

У сучаснай філасофіі існуе паняцце «другі». Яно ўяўляе сабой «персанальна-суб'ектыўную артыкуляцыю феномена,